ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар
ДУ «Мінская абласная
бібліятэка імя А.С.Пушкіна»
___________Н.М.Вашчыла
15.11.2022

**Палажэнне**
**аб анлайн-конкурсе чытальнікаў «Пад Зоркай Венеры», прысвечаным папулярызацыі творчасці Максіма Багдановіча, у рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю»**

**Мэта** анлайн-конкурсу чытальнікаў «Пад Зоркай Венеры» (далей – конкурс) – папулярызацыя творчасці Максіма Багдановіча і прыцягненне ўвагі да абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю».

**Задачы:**

- прыцягнуць увагу шырокай аўдыторыі да вывучэння беларускай літаратуры, прывабіць да пазнання нацыянальных культурных каштоўнасцей;
- стымуляваць творчую актыўнасць вучняў школьных і пазашкольных устаноў, моладзі;
- павысіць чытацкую цікавасць да фондаў ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна» (далей – Бібліятэка).

**Арганізатар конкурсу:** ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна».

**Партнёры конкурсу:** Установа «Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры», Літаратурны музей Максіма Багдановіча, РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» (газета «Літаратура і мастацтва»), грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Мінскае абласное аддзяленне, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, Канал «Культура» Беларускага радыё, Прадстаўніцтва Россупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

**Умовы конкурсу:**

1. Удзельнік запісвае сваё чытанне любога верша паэта на відэа (абавязкова напачатку назваўшы сябе і агучыўшы назву твора), загружае ролік на воблачнае сховішча і высылае спасылку на электронную пошту concurs.bogdanovich@gmail.com з адкрытым доступам на запампоўку.
2. У лісце ўдзельнік таксама дасылае асабісты фотаздымак і паведамляе наступныя звесткі:

| Анкета ўдзельніка | |
|---|---|
| 1. Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| 2. Узрост удзельніка, клас | |
| 3. Адукацыйная ўстанова | |
| 4. Паштовы адрас установы | |
| 5. Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога | |
| 6. Назва выбранага твора | |

| | |
|---|---|
| Максіма Багдановіча | |
| 7. Тэлефон, e-mail для сувязі асабісты ці школы | |

3. Удзельнік, які падаў заяўку, дае згоду на апрацоўку персанальных даных, дазваляе выкарыстоўваць сваю конкурсную работу на сайце бібліятэкі, у сацыяльных сетках з абавязковым пазначэннем аўтарства.
Творчыя работы будуць ацэнены журы, якое вызначыць пераможцаў.
**Крытэрыі ацэнкі відэа:** выразнасць чытання і артыстычнасць выканання.
Акрамя таго, плануюцца прызы сімпатый ад партнёраў конкурсу.
**Мова творчых прац:** беларуская, руская.
**Удзельнікі конкурсу:** дзеці і падлеткі да 18 гадоў.
**Форма правядзення:** усе работы прымаюцца анлайн, удзел у конкурсе БЯСПЛАТНЫ.
4. **Тэрмін прыёму работ:** заяўкі прымаюцца **1-20 снежня 2022 г.**
**У журы конкурсу** ўваходзяць супрацоўнікі Бібліятэкі, а таксама запрошаныя ў склад экспертнага журы:

**Вера Палякова–Макей** – старшыня журы, дырэктар Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра юнага гледача;

**Наталля Вашчыла** – дырэктар ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна»;

**Леанід Крыванос** – старшыня ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Мінскае абласное аддзяленне;

**Міхаіл Бараноўскі** – загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча;

**Алеся Сівохіна** – аўтар і выканаўца ўласных песень, рэжысёр, мастацкі кіраўнік народнага літаратурнага тэатра «Жывое слова».

**Падвядзенне вынікаў конкурсу:** прозвішчы пераможцаў конкурсу і дата цырымоніі ўзнагароджання будуць аб’яўлены на сайце http://pushlib.org.by/ і ў сацыяльных сетках Бібліятэкі, а таксама на сайтах і ў сацыяльных сетках інфармацыйных партнёраў.
**Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны:**
- памятнымі дыпломамі і падарункамі ад нашых партнёраў;
- запрашэннем на выніковае мерапрыемства конкурсу, якое адбудзецца ў Бібліятэцы.

Таксама будуць выбраны **прызёры ў дадатковых намінацыях**, якія будуць узнагароджаны:
- памятнымі дыпломамі і падарункамі ад партнёраў.

Лепшыя творы ўдзельнікаў конкурсу будуць апублікаваны на YouTube-канале і ў сацыяльных сетках Бібліятэкі.

**Кантактная інфармацыя:**

Тэлефоны для даведак: (8 017) 394 16 84; 373 70 43.